–

*Ігар Мацiеўскі*

## СУЧАСНАЯ КАНФЛІКТАЛОГІЯ І ТРАДЫЦЫЙНАЯ МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА

Стан культуры і сацыяльных адносін у Беларусі, Расіі, Украіне, іншых краінах сучаснай Усходняй Еўропы, як і, дарэчы, шэрагу іншых краін і рэгіёнаў Еўропы, Азіі, Амерыкі выклікае сёння сур'ёзныя апасенні.

Некаторыя перадумовы сацыяльна-эканамічных і культурных канфліктаў складваліся паступова. Адны з іх выспяваюць у працэсе станаўлення і пашырэння поля ўзаемадзеяння і апазіцыі ***этнакультурных маргіналіяў*** (карэнных этнічных папуляцый, якія апынуліся за межамі сваіх нацыянальных метраполій з прычыны заснавання на тэрыторыях апошніх – дзяржаў або квазідзяржаўных утварэнняў і, адпаведна, фарміравання і змяненняў палітыка-адміністрацыйных, сацыяльна-эканамічных, канфесійных , культурных межаў (*9*; *6*: 3-21). Іншыя – як вынік гвалтоўнага і т.зв. «добраахвотнага» аб'яднання меншых і колькасным дачыненні**,** і нявроўных ў ваенна-эканамічным плане  нацыянальных фарміраванняў з больш моцнымі і станаўлення рознага роду імперскіх структур, і закладзенай у гэтай сувязі «міны запаволенага дзеяння»: падставаў для далейшых войнаў за нацыянальную незалежнасць, стварэнні культурна-нацыянальных аўтаномій, школ, мастацкіх гурткоў, актывізацыі мэтанакіраваных навуковых даследаванняў, прапаганды этнічных каштоўнасцяў, фарміраванні арганізацый культуры і г.д. (*6*: 4-*7*).

Сёння канфліктная сітуацыя абвастраецца ў сувязі з: а) пашырэннем ва ўсіх напрамках адукацыі, культуры, мастацтва, гуманітарнай навукі сферы ***глабалізацыйных*** тэндэнцый, увасаблення ідэі адзінай сусветнай культурнай цывілізацыі на аснове ***аднаго*** з яе тыпаў (у асноўным, еўрапейскага, амерыканскага, еўразійскага, бліжнесярэднеўсходняга, далёкаўсходняга і г.д.) і, адпаведна, ахоўнымі акцыямі, барацьбой за захаванне і развіццё этнакультурнай самабытнасці; б) пашырэннем зоны і актывізацыяй нацыянальна-культурнай дзейнасці кантактных і дысперсных дыяспар; в) рэзка ўзрослым за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў рухам і тэрытарыяльна-эканамічнай стабілізацыяй (або тэндэнцыяй да стабілізацыі) груп гастарбайтэраў; г) пашырэнне сферы і абвастрэнне міжузроставых канфліктаў.

Фарміраванне і абвастрэнне канфліктных сітуацый у значнай меры абумоўлена не толькі эканамічнымі, але і сацыякультурнымі абставінамі (*10*), спецыфікай існавання, функцыянавання, распаўсюджвання этнамузычных формаў праявы нацыянальнай ідэнтычнасці і барацьбы за гэтую ідэнтычнасць у новых умовах асяроддзя і грамадскага жыцця (Э.Дарашэвіч вельмі прадуктыўна ўводзіць тут тэрмін «рэвіталізацыя фальклору» – 2: 32). Тэарэтычныя, філасофска-культуралагічныя праблемы тут цесна пераплятаюцца з надзённымі, практычнымі . Страты мастацкіх каштоўнасцяў этнічнай культуры ў выніку шматлікіх войнаў, рэпрэсій, ідэалагічных забаронаў істотна пахіснулі, а часам і цалкам разбурылі саму традыцыйную практыку і вопыт стварэння і перадачы мастацкіх каштоўнасцяў (*4*). Этнакультурнае супрацьстаянне уніфікацыі і стэрэатыпізацыі – гэта і барацьба за Чалавека індывідуальна думаючага, які пазнае, творыць, які ўзбагачае духоўнымі каштоўнасцямі сусветную супольнасць уласным унёскам у яе станаўленне і эвалюцыю. І адраджэнне, і развіццё этнічнага мастацтва ў яго бясконцай індывідуальнай, лакальнай, нацыянальнай разнастайнасці сёння становіцца асабліва актуальнай, калі «ўніверсальны, аднолькавы для ўсіх і прыдатны для большасці інтэлект існуе ў жыцці мас людзей толькі як прымітывізаваны і стандартызаваны кампанент амерыканізаванай тэхналогіі, дамінуючай цяпер на планеце ў сістэме кіравання чалавецтвам» (*3*: 12).

У ліку істотных для айчыннай культуры абласцей разам з фальклорам зноў становіцца духоўная музыка. Сёння, у пачатку 3-га тысячагоддзя ў краінах былога СССР, пасля амаль стогадовага перыяду ***секулярызацыі*** грамадства і ***культуры***, антырэлігійнай прапаганды, праследу і рэпрэсіяў супраць носьбітаў і стваральнікаў царкоўнага мастацтва, гвалтоўнага адрыньвання грамадства ад яго спрадвечных традыцый праблема набыла асаблівую актуальнасць.

Яшчэ больш гэтая праблема абвастрылася ў апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, калі вонкава, здавалася б, сітуацыя рэзка змянілася: адноўлены ранейшыя і створана мноства новых храмаў, канфесійных арганізацый, з шырока разгалінаванай іерархічнай структурай, навучальнымі ўстановамі, клубамі; рэлігійная тэматыка захапіла багатае поле кніжнай і мас-медыйнай прадукцыі; на небывалую нават у дарэвалюцыйны час вышыню ўзняты прэстыж рэлігійных дзеячаў, папулярнасць і частата з'яўленняў якіх перад мільёнамі гледачоў часам параўнальная толькі з поп-зоркамі; праваслаўныя святы набылі статус дзяржаўных і г.д. і да т.п.

Разам з тым, гэта, раптам рэанімаваная з'ява ў даўно і грунтоўна складзеным секулярызаваным грамадстве выклікае трывогу сваім, часам вельмі актыўным, адкрыта ідэалагізаваным і нават палітызаваным, агрэсіўным ***неафітцтвам***, распаўсюджваннем толькі знешніх структурных прыкмет сапраўды духоўнай культуры, якія і формай, і зместам сваім хутчэй адмаўляюць, чым падтрымліваюць яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глыбінныя асновы і этычную сутнасць. Сказанае вельмі ярка выяўляецца на характэрных для новага часу (ніколі ў ранейшыя, несекулярызаваныя эпохі айчыннай культуры не праводзіліся) шматлікіх форумах і конкурсах выканаўцаў духоўнай музыкі ў розных гарадах і рэгіёнах Усходняй Еўропы.

Цікавая асаблівасць такіх форумаў – абсалютная перавага ў выкананым рэпертуары толькі твораў спадчыны мінулых стагоддзяў, ад знаменнага распеву да класікі XVIII-XIX стст. У гэтым жа кантэксце, толькі з папраўкай на больш бедны, прымітыўны музычны матэрыял на ўласна царкоўных набажэнствах у шматлікіх парафіяльных храмах, узбагачаў прафесійнымі (з оперных тэатраў і кансерваторый) хорамі і салістамі ў кафедральным саборы пры вялікіх святочных службах (пры абавязковым удзеле прадстаўнікоў дзяржаўнай эліты і ўладных структур). Бо ў аснове духоўнай музыкі – малітва, ***непасрэдны зварот чалавека*** да Госпада. Чалавека свайго часу і месца пражывання, са сваімі, характэрнымі менавіта для яго праблемамі, радасцямі і нягодамі. І як жа ён павінен да Яго звяртацца? Інтанацыямі і словамі іншых эпох, іншых, звяртаўшых свае малітвы людзей? У некаторых пратэстанцкіх цэрквах, малітоўных дамах і сходах самадзейныя малітоўныя тэксты спяваюць пад суправаджэнне рок-музыкі (часам, і караоке) на другога гатунку поп-матывы (часта, далёка не сакральнай уласцівасці). Як аднавіць згубленую ***традыцыю сапраўднага твору***, сапраўднай музыкі інтанацыйна замацаванай малітвы? Якія тут перспектывы ў дыялогу культур?..

Многія стагоддзі чалавек шукаў Бога. Шукаў і сваю дарогу да Яго. І Бог прыйшоў да чалавека, але той, як мы ведаем, далёка не адразу Яго прызнаў. Чалавек шукае свой шлях, шляхоў гэтых усё больш, дарогі ўсё больш варыятыўныя, якая з іх верная? Дапамагчы чалавеку знайсці самую правільную дарогу заклікана царква, малітва, царкоўная песня. Праз сумесныя царкоўныя спевы ў хрысціянскай традыцыі чалавек ўз'ядноўваецца з Богам, з верай і людзьмі і павінен прыйсці да запаветнай мэты (*5*: 117-120).

У гэтым плане ў ліку самых важных для сучаснага мастака і грамадзяніна – адносім задачу выхавання ў людзей патрэбы ў творчым самавыяўленні, разуменні і значэнні ***жывых спеваў*** (як этна-традыцыйных, так і царкоўных), уласнай малітвы, якая зыходзіць ***са сваіх вуснаў***, і сваёй ***непасрэднай прысутнасці*** пры агульным прычашчэнні, усведамлення маргінальнасці ўспрымання народнай і духоўнай музыкі і малітвы толькі праз праслухоўванне гука- ці відэазапісаў. Істотныя задачы ў гэтай сувязі паўстаюць перад сучаснымі кампазітарамі і рэгентамі-дырыжорамі духоўнай музыкі. Канфесійныя традыцыі, якія сфарміраваліся, нярэдка супярэчылі этнічным, што істотна адбілася на супярэчлівасці самасвядомасці і адпаведных вектарах асіміляцыі (*12*; *8*).

У гэтым плане пытанне мовы сёння няпростае і пастаянна выклікае дыскусіі. Слова на стараславянскай мове (у беларускай , рускай , украінскай і некаторых іншых праваслаўных традыцыях), як і лацінскай (доўгі час – адзінай у каталіцкім набажэнстве) і ў новых кампазіцыях з'яўляецца найбольш зручным для спалучэння з духоўнай музыкай. Тым не менш, патрабуе сур'ёзнай дыскусіі выкарыстанне ў духоўных творах слоўнага тэксту на нацыянальных – родных мовах (і нават дыялектах) вернікаў, у тым сэнсе, што змест і выканальніцкая, музычная трактоўка малітвы павінны быць ***найбольш адэкватнымі іх разуменню і перажыванню*** малітоўнага слова, а вымаўленне і ўспрыманне малітвы – шчырым і праўдзівым. Тут узнікае, адпаведна, праблема перакладаў класічных, шмат у чым мнагазначных, сінкрэтычных старажытных кананічных тэкстаў на сучасныя ўкраінскую, беларускую, рускую, румынскую і іншыя мовы. Пераклады гэтыя не маюць яшчэ такіх даўніх царкоўных традыцый, як, напрыклад, пераклады на грэчаскую або грузінскую, і ўсё ж такі вопыт трэба вітаць (*1*; *11*).

Уяўляецца перспектыўным таксама адраджэнне даўніх ***арфаэпічных традыцый*** вымаўлення царкоўна-славянскага слова, набліжанага да нацыянальных моў (напрыклад, да ўкраінскіх дыялектаў Румыніі, Падляшша, Кубані; беларускіх – Смаленшчыны, Браншчыны, Латгаліі і г.д.) і, адпаведна, да лепшага разумення і ўспрымання Слова.

У цэлым, у ліку найбольш актуальных праблем і задач сучаснай музычнай навукі, якія патрабуюць хутчэйшага навуковага разгляду і практычнай рэалізацыі можна вылучыць наступныя:

1. Нацыянальна-мастацкае самавызначэнне, міфалогія і гістарычная факталогія;

2. Агульнабеларускае (агульнаукраінскае, агульнарасійскае і г.д.), агульнанацыянальнае, этнічнае, занальнае, дыялектнае ў станаўленні і развіцці інструментарыя, жанраў і формаў інструментальнай музыкі і песеннага фальклору народаў і краін былога СССР;

3. Узаемадзеянне традыцыйных культур ва ўмовах поліэтнічнай дзяржавы;

4. Палітычныя фактары утварэння нацыянальных мастацкіх, музычных сімвалаў-знакаў і інфармацыйныя канфлікты;

5. Мастацкая і музычная канфліктalогія як вучэбная дысцыпліна ў гуманітарных і мастацкіх ВНУ;

6. Арганалогія, параўнальнае музыказнаўства і этнамузыкалогія як фактар і інструмент спасціжэння і рашэння этнічных і сацыяльных канфліктаў;

7. Міжпакаленныя канфлікты і іх адлюстраванне ў інструментальнай культуры; пола-ўзроставая стратыграфія ў этнічнай музыцы: сацыя- функцыянальныя і музычна-эстэтычныя фактары спараджэння і рашэння канфліктных сітуацый;

8. Музыка і музычная гукарэжысура ў шматнацыянальнай культуры (мастацтва і мас-медыя);

9. Далучэнне моладзі да традыцыйнага інструменталізму як фактар рашэння міжузроставых і этнічных канфліктаў;

10. Рацыянальнае і ірацыянальнае ў музычнай канфліктalогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Тыпалогія і запазычанне ў музычнай культуры як фактары міжэтнічных канфліктаў;
12. Навуковая этыка і міжэтнічныя канфлікты;
13. Малыя або макалькасныя народы і іх унёсак у агульнарасійскую музычную культуру;
14. Маргінальныя і дыяспарныя культуры па абодва бакі дзяржаўных межаў Беларусі, Украіны, Расійскай Федэрацыі і г.д.;
15. Стварэнне навукова-інфармацыйнага поля музычнай канфліктологіі як сучаснай навуковай дысцыпліны.

**Спіс літаратуры:**


1. Вгору серця. Церковний співник Римсько-квтолицької церкви. – Київ : Київсько-Житомирстка дієцезія, 2001. – 938 с.
2. Дарашэвіч, Э. Рэвіталізацыя фальклору / Э. Дарашэвіч // Аўтэнтычны фальклор праблемы захавання, вывучэння, успрыймання. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 32–33.
3. Зиновьев, А. А. Фактор понимания / А. А. Зиновьев. – М. : Алгоритм : Эксмо, 2006. – С. 510–512.
4. Мациевский, И. В. В пространстве музыки / И. В. Мациевский. – СПб. : РИИИ, 2011. – Т. 1. – 206 с.
5. Мациевский, И. В. В пространстве музыки / И. В. Мациевский. – СПб. : РИИИ, 2013. – Т. 2. – 296 с.
6. Мацієвський, І. Традиційний музичний професіоналізм на перехресті доцентрових тенденцій / Мацієвський І. // Проблеми етномузикології. – Київ : НМАУ, 2009. – Ипю4. – С.6–11.
7. Мацієўскі, І. Музычны інгрэдыент як індыкатар гістарычнага субстрату нацыянальна-асымілятыўных традыцый (на матэрыяле этнічный культуры католыкаў паўночнай Беласточчыны) / Мацієвський І. // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэріалы III Міжнар .кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 344–347.
8. Мацієўскі, І. Пытанні нацыянальнага адраджэння маргінальных беларускіх земляў / І. Мацієўскі // Культура беларускага замежжа. Беларуска-амерыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні / Міжнар. асацыяцыя беларусістаў. – Мінск, 1995. – С. 36–39. – (Беларусіка=Albaruthenika, кн. 5).
9. Мажэйка, З. Аўтэнтычны фальклор у сучасным свеце: шлях выжывання і крытычная грань знікнення / З. Мажэйка // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрiалы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001.– С. 261–265.
10. Никитина, Г. А. Культура демографического поведения как ресурс самосохранения народа / Г. А. Никитина // Pax sonoris : история и современность. – Астрахань, 2009. – Вып.3. – С. 90–97.
11. Новый Завет Господа нашего Иисуса Христа / пер. на западно-полесский говор Ф. Д. Климчука. – Минск : ООО «Мэджик», 2010.
12. Sajewicz, M. Zróżnicowanie etniczne, wyznaniowe i językowe Białostocczyzny wschodniej w swiecie badań naukowych oraz w oczach mieszkańców tego regionu / Sajewicz M. // На шляхах да ўзаемаразумення. – Мінск, 2000. – (Беларусіка=Albaruthenika, кн. 15).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ